# ДАЙДЖЭСТ

## АСВЯТЛЕННЯ ЛГБТК+ ТЭМАТЫКІ Ў БЕЛАРУСКІХ МЕДЫЯХ

аўтар: GPress.info

І КВАРТАЛ 2022

## 17 траўня адзначаецца Міжнародны дзень барацьбы з гамафобіяй, трансфобіяй і біфобіяй (IDAHOT Day)

Відавочна, што так званыя беларускія ўлады па-свойму падыходзяць да гэтай важнай падзеі для любой супольнасці, якая жадае развівацца і кіравацца агульначалавечымі каштоўнасцямі.

З якімі ж вынікамі прыйшла Беларусь да IDAHOT Day? Калі меркаваць па рыторыцы праўладных медыяў і палітычных дзеячоў, то ў назве гэтага міжнароднага дня трэба замяніць слова “барацьба”. Таму што самаабвешчаныя ўлады робяць усё дзеля распальвання гамафобіі, трансфобіі ды біфобіі.

Мы падрыхтавалі для вас відэаагляд цкавання супольнасці ЛГБТК+ з боку дзяржпрапаганды і рэжыму Лукашэнкі, якое адбываецца ў цяперашні момант часу (на расейскай і ангельскай мове).

Акрамя звычайнай мовы варожасці ў медыях і палітычных заявах, працягваеццца знішчэнне грамадзянскай супольнасці Беларусі і ўкараненне рэпрэсіўнага заканадаўства.

Са студзеня 2022 года сам факт таго, што вы з’яўляецеся лідарам або актывістам ліквідаванай або незарэгістраванай арганізацыі або ініцыятывы грамадзянскай супольнасці, можа прывесці да пазбаўлення волі на тэрмін да 2 год паводле артыкула 193-1 Крымінальнага кодэкса Беларусі.

Свой унёсак у распальванне нянавісці ўнеслі таксама абмеркаванні зместу новай Канстытуцыі, падчас якіх прапаноўвалася прапісаць забарону прапаганды ЛГБТ у Асноўным законе краіны. На шчасце, гэтага не здарылася. Відаць, улады баяцца нават самой узгадкі скароту ЛГБТ.

Нягледзячы на вымушаную эміграцыю прадстаўнікоў ЛГБТК+ супольнасці Беларусі, мы працягваем актыўную працу, якая скіравана на абарону правоў усіх людзей.

Мы ўпэўненыя, што ў Новай Беларусі Міжнародны дзень барацьбы з гамафобіяй, трансфобіяй і біфобіяй будзе адзначацца на дзяржаўным узроўні!

Рэдакцыя GayPress.



**Дзяржпрапаганда і хэйт: як рэжым Лукашэнкі цкуе ЛГБТ-супольнасць**

Беларускія ўлады ніколі не адрозніваліся талерантнасцю да ЛГБТ-супольнасці, а апошнім часам супраць яе пачалося сапраўднае цкаванне ў дзяржСМІ і сацыяльных медыях.

https://www.dw.com/ru/gospropaganda-i-hejt-kak-rezhim-lukashenko-travit-lgbt/a-60587900



**Карпарацыі (не) супраць хлусні. Як сацсеткі рэагуюць на дзяржаўную прапаганду**

У 2022-м Тэлеграм быў вымушаны запатрабаваць ад некаторых каналаў выдаліць публікацыі, скіраваныя на перасled ЛГБТ і аўтынг. І тое, для гэтага спатрэбілася скарга ад Apple.

https://euroradio.fm/ru/korporacii-ne-protiv-lzhi-kak-socseti-reagiruyut-na-gosudarstvennuyu-propagandu



**У Беларусі ліквідуюць MAKEOUT**

MAKEOUT — беларускі асветніцкі праект пра гендар і сексуальнасць. У 2017 годзе MAKEOUT ужо трапляў у поле зроку сілавых органаў. Тады была сарваная прэзентацыя.

https://reform.news/296768-v-belarusi-likvidirujut-makeout-proekt-posvjashhennyj-genderu-i-netradicionnoj-seksualnosti




**Актывісты прапануюць прапісаць у Канстытуцыі Беларусі забарону на прапаганду ЛГБТ**

Наталля Качанава праводзіць прыём людзей па зборы прапаноў у праект абноўленай Канстытуцыі.

Напрыклад, актывісты прапануюць больш дакладна прапісаць ідэалагічныя пытанні, прыярытэт айчынных законаў над міжнароднымі і нават забарону прапаганды ЛГБТ.

https://blizko.by/notes/aktivisty-predlagayut-propisat-v-konstitutsii-belarusi-zapret-na-propagandu-lgbt_na




**Забарона ЛГБТ, смачная ежа, бясплатная адукацыя. Чаго жадаюць супрацоўнікі «Агракамбіната “Дзяржынскі”»?**

Алена Курхінен выправілася ў гэты раз у Фаніпаль, дзе наведала і сам агракамбінат, і пагутарыла з супрацоўнікамі сельгаспрадпрыемства на тэму будучага рэферэндума.

https://mlyn.by/01022022/zapret-lgbt-vkusnaya-eda-besplatnoe-obrazovanie-chego-hotyat-sotrudniki-agrokombinata-dzerzhinskij/



**Не толькі жанчыны. Чатыры факты заняткаў прастытуцыяй выяўлена ў Баранавічах**

Апроч жанчын сярод гандлярамі ўласным целам ёсць і мужчыны, а менавіта прадстаўнікі ЛГБТ супольнасці. Усе яны “палявалі” на кліентаў у інтэрнэце.

https://brestcity.com/blog/ne-tolko-zhenshhiny



**“Беларусь і Расія знаходзяцца ў авангардзе барацьбы за захаванне нашага свету”**

“Ва Украіне даўна пачаты працэс падмены паняццяў, калі моладзі ўнушаюць, што ЛГБТ – гэта норма, а героямі з’яўляюцца Бандэра і Шухевіч. У гэтых умовах важна змагацца за захаванне нашага свету, а ў авангандзе гэтай барацьбы – саюз Беларусі і Расіі.” Пра гэта ў эфіры паведаміў калумніст выдання “Палітэксперт” Уладзімір Еранасян.

https://ont.by/news/vladimir-eranosyan-belarus-i-rossiya-nahodyatsya-v-avangarde-borby-za-sohranenie-nashego-mira



**Дзесяць прыкметаў таго, што вы асексуальныя**

Што такое асексуальнасць? Гэты тэрмін шырока разумеецца няслушна.

Асексуал – гэта асоба, якую не вабіць аніводзін з палоў. Асексуальныя людзі не баяцца абавязальніцтваў або сексу, бо яны папросту не маюць палавой цягі. І яны звычайна не зацікаўленыя ў сексуальнай актыўнасці.

https://grodno24.com/2022/01/desyat-priznakov-togo-chto-vy-aseksualny.html




**Юрый Караеў: “Гістарычная памяць аб Вялікай Айчыннай вайне – гэта краевугольны камень свядомасці славянаў”**

“Гістарычная памяць аб Вялікай Айчыннай вайне – гэта краевугольны камень свядомасці славянаў. І вось гэта вось узаконіць, што пакуль нашыя людзі не гатовыя і, дай бог, не будуць гатовыя ніколі да гэтага (ЛГБТ, шлюбаў аднаполых) і, як след, – знікнення нашай нацыі, нашай супольнасці славянскай.”

https://rgazeta.by/ru/authority/yurij-karaev-istoricheskaya-pamyat-o-

**Запрашаем на Gay Press!**

**Мы ў сацыяльных сетках**

**YouTube**

**TikTok**

**Telegram**

**Facebook**

**Instagram**

**ВКонтакте**

**Яндекс.Дзен**

**Twitter**

**E-mail: gaypresseu@gmail.com**